# Лёсы Вялікай Айчыннай: заробкі выратавалі жыццё

З успамінаў жыхаркі аграгарадка Спонды, маці з дачкой Антаніна Багдановіч і Валянціна Крэміс, падзяліліся гісторыямі жыцця сваіх родных у гады Вялікай Айчыннай.

**СВЕДКА ПАДЗЕЙ**

Беларусы Ільяш і Антаніна Багдановічы знайшлі сваё каханне ў Латвіі – там маладажоны сустрэлі і вайну.

Дзяўчына з Віцебшчыны і хлопец з Гродзеншчыны пазнаёміліся на заробках у латышскім сяле Ранка.

*– Мамка мая, Фрузына, спярша адна паехала на заробкі, а тады вярнулася за мной,* ***– расказвае Антаніна.*** *– А брата Сашку пакінула ў сям'і свайго бяздзетнага брата – надта ж прасілі, каб не везла яго з сабой. Гаспадар, у якога мы працавалі, зваўся Трумпманіс – харошы быў чалавек. Пакуль там жылі, я навучылася па-латышску шпарыць – не адрозніць маёй мовы ад мясцовых было.*




Там жа Праскоўя (Фрузына) прысватала сваю шаснаццацігадовую дачку Тоню да старэйшага за яе на 12 гадоў Ільяша Багдановіча – надта ж падабаўся маці гэты працавіты малады чалавек.

*– У Латвіі нас і вайна напаткала. У маі 1944-га я Валю нарадзіла… –* **узгадвае жыхарка Спондаў.** *– Божа, як успомню: страляюць, бомбы як зачалі рвацца, а ў мяне дзіця малое! І нікуды ж не дзенешся – я адна: мамку немцы забралі акопы капаць, мужык на вайне…*

Ільяш Купрыянавіч Багдановіч ваяваў у польскай арміі.



Пакуль Праскоўя з дачкой перажывала нялёгкія часы на чужыне, у іх роднай вёсцы Баравыя адбылася трагедыя: сын загінуў, а мужа занясло аж у Інданезію.

*– Брату было 15… Ён з дзядзькам ішоў у гумно – немцы там сабіралі, адзін з іх і падказаў: не ідзі, там будуць паліць людзей. А Саша: я ўсё роўна пайду туды, там тата, дзе ён, там і я,* **– з непрыхаваным болем гаворыць Антаніна Фёдараўна.** *– З гумна брату ўдалося вырвацца – пабёг ён у лес. На ўскрайку яго дагнала нямецкая куля. У той дзень хто схаваўся, хто ўцёк, а хто і згарэў… Бацька мой тады ўратаваўся: уцёк – і трапіў аж на востраў Ява. Там і загінуў.*

*– Людзі, уцякаючы ў лясы, спадзяваліся вярнуцца, не думалі, што вёска не ацалее, таму закопвалі пасцілкі, ежу, адзенне,* **– далучаецца да размовы, узгадваючы расповеды родных, дачка Антаніны Валянціна.** *– Нічога не знайшлі, як вярнуліся, – усё падаставана было. Ды і жыць не было дзе – усё спалена…*

Так пасля заканчэння вайны сям’я Багдановіч прыехала на радзіму Ільяша – на Астравеччыну, у вёску Жукойні-Жалядскія.

**ДЗІЦЯ ВАЙНЫ І ЖОНКА ВЕТЭРАНА**

Валянціна Ільяшаўна «прыдакранулася» да падзей тых страшных часоў двойчы, праўда, з адлегласцю ў некалькі дзясяткаў гадоў: жанчыне было наканавана нарадзіцца за год да заканчэння Вялікай Айчыннай і выйсці замуж за ветэрана гэтай вайны.

*– Цяжка маім бацькам жылося: працавалася нялёгка, як іх гаспадарку ў калгас забралі, яны таксама пайшлі туды працаваць, а ўсё ж уручную трэба было рабіць, не тое што жывёле, людзям ежы не хапала,* ***– кажа Валянціна Крэміс.*** *– Сем’ям з малымі дзецьмі належала дапамога, дык маці з бацькам мяне «прымаладзілі»: запісалі, што нарадзілася ў 45-м.*




*– Я вайны не памятаю, а Мікалай, мой муж, ваяваў з самага пачатку і дайшоў да Берліна!* ***– працягвае жанчына.***

Мікалай Крэміс родам з вёскі Гараўляны, што на Глыбоччыне. Яго прызвалі ў Чырвоную армію ў 1941-м, мужчына трапіў у мінамётны полк.



*– З вёскі іх трое пайшло, разам і ваявалі,* **– дзеліцца Валянціна Ільяшаўна.** *– А вярнулася двое… З Бараўлян людзей таксама папалілі, як і ў нашых Баравых, і ў Пастэрнаках, дзе маміна цётка жыла.*

Мікалай расказваў Валянціне, як змагаліся з ворагам урукапашную, калі заканчваліся патроны; як капалі ў лесе ямы, каб паспаць, а коўдру замянялі яловыя лапкі.

*– Мой муж быў гарманістам. Праўда, гармоніка з сабой на вайне ў яго не было – дык хлопцы часта прасілі, каб хоць так зацягнуў якую песню. І ён зацягваў, каб падбадзёрыць і іх, і сябе,* **– узгадвае ўспаміны ветэрана яго жонка.** *– І «Кацюшу» спяваў абавязкова!*

Перамогу Мікалай сустрэў у Берліне. Мужчына часта ўзгадваў, як весела было, радасна, як адзін аднаго абдымалі, цалавалі.

Дарога дамоў была доўгай: ехалі цягнікамі, шмат перасадак.

*– У вагоне ў некага была трохрадка,* **– расказвае Валянціна.** *– Мой казаў,*

*што от тады найграўся, а салдацікі танцавалі ад радасці, што на Радзіму вяртаюцца, а тут яшчэ і музыкант весяліць…*

Відаць, добра апекаваўся Мікалаем Крэмісам яго анёл-ахоўнік: мужчына прайшоў вайну ад пачатку і да канца – цэлым.

*– Ні разу мой мужык паранены не быў. Ён хрышчоны,* ***– тлумачыць магчымыя прычыны шанцавання жанчына.*** *– І як ішоў ваяваць, узяў з сабой асвечаны хлеб і яшчэ адзін абярэг, не ўспомню, што, зашыў пад каўнерык – з ім і прайшоў усю вайну.*

Пасля Перамогі Мікалай вярнуўся на Глыбоччыну, а потым пераехаў у Вільнюс, туды ж і бацькоў сваіх забраў.

На Спондаўшчыне ветэран пражыў апошнія 15 гадоў. Тут і пахаваны.

*– А Дзень Перамогі для мужа быў заўсёды асаблівым святам. Ён радаваўся, што ў гэтым ёсць і яго ўнёсак,* ***– гаворыць Валянціна Ільяшаўна.*** *– Мікалая часта запрашалі на сустрэчы са школьнікамі.*

Пэўныя  звесткі пра баявы шлях Мікалая Мікалаевіча, акрамя расказаў яго  жонкі, можна даведацца і з яго ўзнагарод.

Так, з Падзячнага ліста за выдатныя баявыя дзеянні бачна, што наш зямляк  удзельнічаў у баях за гарады Рацібор і Біскау, якія з’яўляліся важнымі вузламі дарог і моцнымі апорнымі пунктамі немцаў на левым беразе Одэра. Ёсць Падзяка за ўдзел у баявых дзеяннях пры прарыве ворага на рацэ Нейсе, а таксама за авалоданне нямецкімі гарадамі Люббен, Цоссен, Лукенвальдзе і іншымі.  Дарэчы, акрамя ўручэння Падзяк войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за гэтыя гарады,  загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага 21 сакавіка 1945 года салютавалі ў Маскве 12 артылерыйскімі залпамі са 124 гармат.

Чырвонаармеец Крэміс быў узнагароджаны медалём «За ўзяцце Берліна» за ўдзел у гераічным штурме і ўзяцце Берліна, медалём «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.», ордэнам Вялікай Айчыннай вайны ІІ ступені.



„ЗА ПОБЕДУ НАД ГЕРМАНИЕЙ
В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ
1941—1945 гг."

НАШЕ ДЕЛО ПРАВОЕ
МЫ ПОБЕДИЛИ

УДОСТОВЕРЕНИЕ

За участие в Великой
Отечественной войне
Красноармеец
Кремнис
Николай Николаевич
указом Президиума Верховного
Совета СССР от 9 мая 1945 года
награжден медалью
„За победу над Германией
в Великой Отечественной
войне 1941—1945 гг."
От имени Президиума Верховного
Совета СССР медаль вручена
„2" мая 1946 г.
Командир 421 Минометного
(должность, воинское звание и подпись лица,
М. П. Берлинского полка
вручившего медаль)
Подполковник Мельников

Узнагародныя дакументы мужа Валянціна Крэміс перадала ў музей Спондаўскай школы.

***Так, ва ўспамінах, фотаздымках, сведчаннях афіцыйных папер, спадзяюся, яшчэ доўга мы будзем зберагаць памяць пра родных і блізкіх, землякоў, усіх тых, хто падарыў нам вольнае жыццё. Каб не паўтарыць бяды і ведаць цану Перамогі…***

Тэкст:
Фота: **Рыта Дрэма і з архіва сям'і Крэміс**
https://www.ostrovets.by/news/novosti/news25028.html